# З юбілеем, Лідзія Сымонаўна



Лідзія Сымонаўна (Сямёнаўна) САВІК (нар. 1 сакавіка 1936, в. Камуна Любанскага р-на Слуцкай акругі, цяпер Менская вобл.) — беларускі літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1977).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Бацькі Адам Васілевіч і Алена Піліпаўна Адзярыхі, разам з Эмануілам Модзіным, Цімафеем Смірновым і інш., былі арганізатарамі камуны (в. Камуна) на Мар'інскім балоце над р. Арэсай. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны бацька пайшоў на фронт, загінуў у 1941 г. пад Масквой. Камуну спалілі немцы, маці з двума дзецьмі, Лідай і Ірынай, знаходзілася ў партызанскім атрадзе «Камсамолец» брыгады імя Панамарэнкі, была сувязной, потым — у гаспадарчым звязе. Пасля вызвалення Беларусі жылі ў Любані. Потым, у сувязі з пераводам айчыма Сымона Шыкунова па працы і пераездам сям'і. Ліда жыла ў Барысаве, Заслаўі, Дзяржынску.

Працавала піянерважатай у Вязанскай школе Дзяржынскага раёна (1954-1955), у Дзяржынскай школе № 1 (1955-1959), у 1959 пераехала ў Менск, працавала ў Менскай школе № 62. Скончыла філалагічны факультэт БДУ (1962), Інстытут удасканалення настаўнікаў (1964), аспірантуру. Працавала ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Я. Коласа АН БССР (1966—1978). У 1977 абараніла кандыдацкую дысертацыю па праблемах сучаснай беларускай літаратуры. З 1978 працуе ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. малодшым, затым старшым навуковым супрацоўнікам. адначасова з 1982 у Беларускім універсітэце культуры. Выкладала ў ВНУ беларускую літаратуру, чытала спецкурсы пра творчасць рэпрэсаваных і эміграцкіх пісьменнікаў. З 1992 — дацэнт Беларускага ўніверсітэга культуры, чытае курс лекцый па сучаснай беларускай літаратуры. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (з 1992). Адна з арганізатараў і сакратар Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», член Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Сакра гар секцыі крытыкі Саюза беларускіх пісьменнікаў, старшыня камісіі па вяртанні спадчыны беларускіх пісьменнікаў.

Муж - М. П. Савік. навуковец-кібернетык.

Літаратурнай дзейнасцю займаецца з 1970-х г. Дэбютавала ў друку артыкулам «Сучасная беларуская проза» (1974). Кірунак навуковай дзейнасці — праблемы развіцця бе-ларускай літаратуры 20 ст. Ат-рымала дазвол на працу ў архівах КДБ, сабрала дакладныя звесткі пра лёс рэпрэсаваных беларускіх паэтаў і празаікаў. Даследуе эміграцкую беларускую літаратуру, збірала матэрыялы пра жыццё і дзейнасць вядомых беларусаў у Францыі, Германіі і ЗША.

Выдала творы рэпрэсаваных пісьменнікаў Я. Нёманскага «Творы» (1984), С. Баранавых «Новая дарога» (1989), Б. Мікуліча «Аповесць для сябе» (1993) і інш. Даследуе таксама эміграцкую беларускую літаратуру. Апублікавала нарысы жыцця і творчасці Н. Арсенневай, М. С'яднёва, У. Дудзіцкага, Хв. Ільяшэвіча, У. Случанскага. Аўтар шматлікіх артыкулаў і рэцэнзій пратворчасць сучасных аўтараў В. Быкава, Я. Брыля, І. Шамякіна. С. Грахоўскага, А. Марціновіча, А. Кудраўца, Я. Сіпакова. В. Карамазава, А. Жука, В. Іпатавай, М. Гіля, а таксама пайшоўшых з жыцця — І. Мележа, У. Караткевіча, А. Асіпенкі, Б. Сачанкі, Я. Скрыгана, Л. Геніюш.

Аўтар манаграфій «Адчуванне часу», «Пад мірным небам Бацькаўшчыны», «Каб не астыла цяпло зямлі», суаўтар кніг «Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20-30-х гадоў» (1985), «Сыны і пасынкі Беларусі» (1996), «Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы» (2001). «Культура беларускага замежжа» і інш. Выдала кнігу „Космас беларуса": жыццяпіс Б. У. Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта» пра Б. Кіта — - акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Аўгар шэрагу даследаванняў пра творчасць беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў, напр. «Пакліканыя: літаратура беларускага замежжа» (2001). Аўтар звыш 100 артыкулаў і рэцэнзій, 230 энцыклапедычных артыкулаў. Друкуецца на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў.

Актыўны сябар ТБМ.

*Выбраныя творы.*

Праблемы сучаснай беларускай «вясковай» прозы. (Агульны агляд мастацкай і крытычнай літаратуры) // Кніга, библиотечное дело и библлография в Белоруссии. — Минск. 1974. С. 179—194;

Проблемы современной белорусской «деревенской» прозы. (10.01.03) Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата филологнческих наук /АН БССР Институт литературы им. Янки Купалы/. — Минск. 1977.21 с.;

Адчуванне часу. Тэма вёскі ў сучаснай беларускай прозе. — Мінск. 1981,

Каб не астыла цяпло зямлі. Беларуская проза 70 - пачатку 80-х гг.). — Мінск. 1984;

Пад мірным небам Бацькаўшчыны. Нарыс творчасці Барыса Сачанкі. — Мінск. 1986. 120 с.

Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта. — Мінск. 1993. 75 с.;

Космас беларуса. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта. — Мінск. 1996. 381 с; 2 выд. — Мн.. 1998. 44<-> с.;

Пакліканыя. Літаратура беларускага замежжа. — Мінск. 2001. 478 с.;

Адна між замкаў: Літаратурны партрэт Волгі . Іпатавай - Мінск 2003 165 стр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ